# ЗАХАВАННЕ ЎЗОРАЎ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК ФОРМА САЦЫЯЛЬНАГА СЛУЖЭННЯ ЦАРКЫ

**ПАВЕЛ БУЛАТЫ**
МАГІСТАР КІРАВАННЯ

# Царква - неадменная частка складанай сістэмы сацыяльных узаемаадносін

галоўнай формай сацыяльнага служэння Царквы ў наш час застаецца традыцыйная форма, а менавіта – дапамога тым, хто знаходзіцца ў складанай жыццёвай сітуацыі













У сучасным грамадстве вылучаецца такая форма сацыяльнага служэння Царквы, як захаванне культурна гістарычнай спадчыны. Абумоўлена гэта важнай роляй, якую адыгрывае спадчына, у тым ліку і царкоўная, ў жыцці грамадства.







# Для любога народа захаванне царкоўнай культурнай спадчыны важна па трох прычынах:

- **па-першае**, гісторыка-культурная спадчына істотна ўздзейнічае на свядомасць і самасвядомасць людзей, дазваляе ім адчуць сваё дачыненне да культурнай традыцыі многіх пакалення;
- **па-другое**, гісторыка-культурная спадчына з'яўляецца досыць аб'ектыўным сведчаннем мінулага;
- **па-трэцяе**, гісторыка-культурная спадчына – гэта частка матэрыяльнай і духоўнай культуры, створаная, захаваная і перададзеная сучаснікам як нешта ўшанаванае і ўнікальнае, як нязменная каштоўнасць.







# Царкоўная спадчына



Архітэктура



Кнігазборы



Іканапіс

**На канкрэтным прыкладзе – прыкладзе ўнікальных узораў іканапісу з царквы Святога Духа ў вёсцы Вялікае Падлессе (Ляхавіцкі раён) разгледзім, як Царква выконвае форму сацыяльнага служэння па захаванню культурна-гістарычнай спадчыны.**






# У канцы XVIII ст. ляхавіцкі прыход быў перанесены ў вёску Вялікае Падлессе






# У Падлескай царкве Святога Духа захаваліся цудоўныя прыклады беларускага іканапісу XVII ст.

Іканапіс Беларусі гэтага перыяду уяўляе сабою арыгінальную з’яву еўрапейскай культуры. Ён развіваўся адначасова з манументальным і свецкім мастацтвам і захаваў дзве магутныя галіны еўрапейскай культуры: іканапіс і алтарны жывапіс, якія існавалі ва ўзаемаўплыве і ўзаемаўзбагачэнні, што не мае прамых аналогій у мастацтве Заходняй і Усходняй Еўропы і караніцца ў гістарычных асаблівасцях развіцця Беларусі, размешчанай на стыку лацінскага захаду і праваслаўнага ўсходу, што ў сваю чаргу спрыяла ўзнікненню цесных сувязей мастацтва як з візантыйскай, так і з заходнееўрапейскай культурай.

# Галоўнай мастацкай перлінай у падлескім іканапісным зборы з’яўляецца абраз Маці Божай Падлескай, які лічыцца цудадзейным





- Адносна паходжання існуе легенда;
- Выканана іконы ў тэхніцы тэмпера на дубовай дошцы;
- Згадваецца ў акце візітацыі 1680 г.

# «Цуд Юрыя» і «Тры сяціцелі»





У апісанне царквы за 1879 г. змяшаюцца звесткі адносна царкоўнага іканастасу. Адзначаецца, што ён новага ўстройства, драўляны і змяшчае 7 абразоў старога пісьма, а 5 – новага. Дадзеная мадэль іканастасу захавалася да нашага часу






**У царкве знаходзяцца таксама два бакавыя драўляныя, дэклараваныя разьбою алтары кан. XVIII ст., у якіх, аднак, змяшчаюцца іконы XIX ст. Апроч твораў іканапісу варта зазначыць наяўнасць у царкве карцін на біблейскую тэматыку: Страшны Суд і Суд над Хрыстом (на датаваныя).**









**У Падлескім прыходзе ўзоры іканапісу аберагаюцца вельмі пільна і стаўленне да іх вельмі педантычнае, у мясцовых жыхароў іконы знаходзяцца ў вялікай пашане.**



**У сучасным свеце сацыяльнае служэнне Царквы не абмяжоўваецца выключна яго класічнымі формамі, а пад уплывам фактараў знешняга асяроддзя і грамадскіх тэндэнцый з’яўляюцца новыя формы. Зберагання і ўшанаванне ўзораў старажытнага іканапісу адыгрывае важную ролю ў фармаванні нацыянальнай і рэлігійнай ідэнтычнасці, што спрыяе ўмацаванню традыцыйных каштоўнасцей у грамадстве. Важна, каб у царкоўных прыходах усведамлялася роля спадчыны і працэс яе захавання разглядаўся менавіта як сацыяльнае служэнне. Так Царква зможа захаваць свае здабыткі, якія накопліваліся чалавецтвам цягам стагоддзяў. Дачыненне да царкоўнай культурнай спадчыны ўзбагачае чалавека, пашырае яго магчымасці і перакладае яго ўзаемадзеянне з Царквой і навакольным светам на якасна іншы ўзровень.**